ЗАЦВЯРДЖАЮ
Намеснік начальніка ўпраўлення
культуры Гродзенскага
аблвыканкама
С.В. Куратчык
2024 г.

# ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзення
абласнога фестывалю хароў
і ансамбляў песні і танца
“Над сінім Нёманам”

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю хароў і ансамбляў песні і танца “Над сінім Нёманам”, прысвечанай 80-й гадавіне вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (далей – Фестываль).

2. Мэтамі і задачамі Фестывалю з’яўляюцца:

- пашырэнне музычна-асветніцкай дзейнасці харавых калектываў і ансамбляў песні і танца;
- удасканаленне выканальніцкага майстэрства дзеючых калектываў;
- далучэнне навучэнцаў да слаўнай гістарычнай спадчыны Беларусі;
- папулярызацыя лепшых традыцый і дасягненняў беларускай нацыянальнай кампазітарскай школы ў справе выхавання грамадзянскасці і патрыятызму шырокіх слаёў насельніцтва, у першую чаргу – дзяцей і моладзі;
- актывізацыя творчай і канцэртнай дзейнасці;
- узбагачэнне рэпертуару аматарскіх калектываў лепшымі творамі беларускага мастацтва;
- па выніках Фестывалю лепшыя калектывы будуць рэкамендаваны для ўдзелу ў Рэспубліканскай харавой акцыі “Помним. Чтим. Гордимся!”

3. Арганізатарамі Фестывалю з’яўляюцца: упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама, дзяржаўная ўстанова культуры “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” (далей – ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”), аддзел культуры Лідскага райвыканкама, УА “Гродзенскі дзяржаўны музычны каледж” (дадатак 1).

4. Фестываль праводзіцца 1 раз у 3 гады.

5. Фестываль адбудзецца: **18 мая 2024** года на базе ДУ “Палац культуры горада Ліды”, **19 мая 2024 года** на базе УА “Гродзенскі дзяржаўны музычны каледж”.

6. У Фестывалі прымаюць удзел калектывы (незалежна ад ведамаснай прыналежнасці):

- з найменнем “народны”, “узорны”, званнем “Заслужаны”: харавыя калектывы, ансамблі песні і танца;

- харавыя калектывы ці ансамблі песні і танца без наймення “народны”, “узорны”.

7. У праграму выступлення кожнага калектыву ўключаюцца 2 творы:

**для харавых калектываў:**

- твор *a cappella,*
- твор беларускіх аўтараў ці апрацоўка беларускай народнай песні;

**для ансамбляў песні і танца:**

- вакальна-харэаграфічная кампазіцыя,
- твор беларускіх аўтараў на выбар (харэаграфічны нумар, вакальна-харавы нумар, вакальна-харэаграфічная кампазіцыя), прычым музычнае суправаджэнне – ансамбль народных інструментаў альбо якасная фанаграма “-1”.

8. Не дазваляецца выкананне 2-х твораў самадзейных аўтараў.

9. Рэкамендавана ўключыць у рэпертуар калектываў-удзельнікаў Фестывалю нумар з пераліку сачыненняў беларускіх кампазітараў (дадатак 2).

10. Пры падвядзенні вынікаў Фестывалю журы (дадатак 3) карыстаецца наступнымі крытэрыямі: выканальніцкае майстэрства; сцэнічная культура; мастацкі ўзровень рэпертуару; арыгінальнасць апрацоўкі; рэжысура канцэртнага нумара; якасць музычнага суправаджэння.

11. Па выніках Фестывалю журы вызначае лаўрэатаў I, II, III ступені і ўзнагароджвае прызамі і дыпломамі ў рамках у наступных намінацыях:
дарослы ансамбль песні і танца;
дарослы хор (харавы калектыў);
дзіцячы хор (харавы калектыў).

12. Дадаткова журы ўзнагароджвае ўдзельнікаў спецыяльнымі дыпломамі ў рамках і прызамі:

лепшая інструментальная (аркестравая) група;
лепшая харэаграфічная група;
за лепшую апрацоўку беларускай народнай песні;
за лепшае рэжысёрскае вырашэнне нумара;
за лепшае спалучэнне харэаграфічнага і вакальнага жанраў;
за яркае мастацкае ўвасабленне тэмы радзімы;
за захаванне традыцый беларускай народнай песні (танца);
за лепшае выкананне твора беларускіх аўтараў.

13. Астатнія ўдзельнікі фестывалю атрымліваюць дыпломы за ўдзел у Фестывалі.

14. Узнагароджванне пераможцаў Фестывалю адбудзецца **3 ліпеня 2024 года** ў г. Гродна на святочных мерапрыемствах, прысвечаных Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

15. Па выніках выступленняў лепшыя калектывы будуць запрошаны для ўдзелу ў Рэспубліканкай акцыі “Хоровое вече” (час і месца правядзення – верасень 2024 года, г. Мінск).

16. Пры адсутнасці ўдзельнікаў у намінацыі журы мае права аб’ядноўваць намінацыі, не прысвойваць месцы, вызначаць дадатковыя спецыяльныя дыпломы і прызы ў межах выдзеленага прызавога фонду Фестывалю.

17. Рашэнне членаў журы па выніках Фестывалю фіксуецца ў пратаколе (падпісваюць усе члены журы), які размяшчаецца не пазней 10 каляндарных дзён з дня правядзення Фестывалю на афіцыйным сайце ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” gromc.by/.

18. Рашэнне журы з’яўляецца канчатковым і перагляду не падлягае.

19. Для ўдзелу ў Фестывалі неабходна аформіць агульны спіс калектываў-удзельнікаў ад раёна і горада Гродна, заяўку (дадатак 4) на кожны калектыў асобна, зацверджаную начальнікам (загадчыкам) аддзела (сектара) культуры (адукацыі) гар(рай)выканкама. Усе дакументы неабходна даслаць да **1 мая 2024 года** на электронны адрас ДУК “Гродзенскі АМЦНТ” **info@gromc.by** с пазнакай “Над сінім Нёманам” кантактныя тэлефоны: +375152623785.

20. Фінансаванне Фестывалю ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных у каштарысе ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” на цэнтралізаваныя мерапрыемствы.

21. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуюцца: прызы, спецыяльныя прызы, дыпломы, рамкі для дыпломаў.

22. Для фінансавання Фестывалю на ўсіх этапах могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

23. Аргкамітэт пакідае за сабой права ўносіць змены ў дадзеную Інструкцыю аб парадку арганізацыі і правядзення, а таксама перанос даты правядзення Фестывалю (у іншыя тэрміны).

24. Арганізатары Фестывалю захоўваюць неабмежаваныя правы на запіс і распаўсюджванне выступленняў калектываў рознымі тэхнічнымі сродкамі і спосабамі. За дадзеныя запісы ганарары выканаўцам не выплачваюцца.

Дадатак № 1
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю хароў і ансамбляў песні і танца “Над сінім Нёманам”

## СКЛАД АРГКАМІТЭТА
абласнога фестывалю хароў і ансамбляў песні і танца
“Над сінім Нёманам”

| | |
|---|---|
| Клімовіч А.В. | начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *старшыня аргкамітэта;* |
| Пекар А.Ю. | галоўны спецыяліст аддзела культурна-асветнай работы, мастацтваў і навучальных устаноў упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *намеснік старшыні аргкамітэта*; |
| Леўшунова Н.Ф. | начальнік аддзела культуры Лідскага райвыканкама; |
| Мерчы Т.І. | загадчык аддзела аматарскай творчасці і культурна-дасугавай дзейнасці ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Сарасек Г.П. | дырэктар УА “Гродзенскі дзяржаўны музычны каледж”; |
| Хільмончык К.В. | дырэктар ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”. |

Дадатак № 2
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю хароў і ансамбляў песні і танца “Над сінім Нёманам”

Пералік сачыненняў беларускіх кампазітараў, рэкамендаваных для ўключэння ў рэпертуар калектываў-удзельнікаў абласнога фестывалю хароў і ансамбляў песні і танца “Над сінім Нёманам”

1. Муз. І. Лучанка, сл. Р. Раждзественкага. “Если бы камни могли говорить”.
2. Муз. Н. Сакалоўскага, словы А. Астрэйкі. “Песня пра Нёман”.
3. Муз. И. Лучанка, сл. Н. Талупавай. “Соловьи Хатыни”.
4. Муз. И. Лучанка, сл. Г. Пятрэнкі. “Хатынь”.
5. Муз. У. Алоўнікава, сл. А. Русака. “Лясная песня”.
6. Муз. У. Алоўнікава, сл. А. Астрэйкі. “Песня о Заслонове”.
7. Муз. К. Пукста, сл. М. Танка. “Партызанскія акопы”.
8. Беларуская народная песня “Із далёкіх, із краёў”.
9. Муз. Я. Глебава, сл. Н. Гілевіча. “Санет памяці”.
10. Муз. Ю. Семянякі, сл. У. Карызны. “Люблю цябе, Белая Русь”.
11. Муз. А. Атрашкевіч, сл. В. Жуковіча. “Шуімяць яліны”.
12. Муз. У. Браілоўскага, сл. Р. Гамзатава. “Адрес моей любви”.
13. Муз. Л. Захлеўнага, сл. К. Цыбульскага. “Солдат Победы”.
14. Муз. В. Раінчыка, сл. Л. Пранчака. “Цветы Победы”.
15. Муз. І. Лучанка, сл. М. Ясеня. “Майский вальс”.

Дадатак № 3
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю хароў і ансамбляў песні і танца “Над сінім Нёманам”

## СКЛАД ЖУРЫ
абласнога фестывалю хароў і ансамбляў песні і танца “Над сінім Нёманам”

| | |
|---|---|
| Куратчык С.В. | намеснік начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *старшыня журы;* |
| Цямчык Т.Г. | хармайстар ДУК “Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь “Ансамбль танца, музыкі і песні “Белыя росы”, *сустаршыня журы;* |
| Давыдзік С.М. | начальнік аддзела культурна-асветнай работы, мастацтваў і навучальных устаноў упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *намеснік старшыні журы;* |
| Басякова Ю.А. | выкладчык харэаграфічных дысцыплін УА “Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў”; |
| Кімкетава А.А. | намеснік дырэктара, балетмайстар-пастаноўшчык ДУК “Музычны тэатр “Рада”; |
| Мерчы Т.І. | загадчык аддзела аматарскай творчасці і культурна-дасугавай дзейнасці ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Пекар А.Ю. | галоўны спецыяліст аддзела культурна-асветнай работы, мастацтваў і навучальных устаноў упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама; |
| Хільмончык К.В. | дырэктар ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”. |

Дадатак № 4
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю хароў і ансамбляў песні і танца “Над сінім Нёманам”

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік (загадчык) аддзела (сектара) культуры гар(рай)выканкама

**ЗАЯЎКА**
на ўдзел у абласным фестывалі хароў
і ансамбляў песні і танца “Над сінім Нёманам”

1. Намінацыя ____________________
2. Поўная назва калектыву ____________________
3. База дзейнасці калектыву ____________________
4. Дата і месца выступлення (неабходнае падкрэсліць)
   **18 мая – ДУ “Палац культуры горада Ліды”**
   **19 мая – УА “Гродзенскі дзяржаўны музычны каледж”**
5. Колькасць удзельнікаў калектыву ____________________
6. Прозвішча, імя, імя па бацьку кіраўніка калектыву ____________________
7. Кантактны тэлефон кіраўніка калектыву ____________________
8. Назва твораў (аўтар апрацоўкі, пастаноўшчык нумароў, без скарачэнняў) ____________________
9. Працягласць гучання праграмы ____________________
10. Наяўнасць ансамбля народных інструментаў (прозвішча, імя, імя па бацьку кіраўніка, склад і колькасць інструментаў)____________________
____________________
11. Наяўнасць фанаграмы “-1” (электронны носьбіт) ____________________
____________________
11. Неабходны тэхнічны райдар____________________
12. Творчая характарыстыка калектыву (да 50 слоў) ____________________ (ці дадатак)____________________

Кіраўнік базавай установы

____________________
(подпіс з расшыфроўкай)

Заяўкі на ўдзел у фестывалі дасылаць да 1 мая 2024 года с пазнакай “Над сінім Нёманам” на адрас: 230025, г. Гродна, вул. Савецкая, 8, ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”. Кантактны тэлефон: +375152623782, e-mail: info@gromc.by

**Увага! Заяўка павінна быць у дзьвух фарматах: PDF (з пячаткай і подпісам) і WORD.**